# Тут мужнеў дзёрзкі голас «Звязды»…

**Студзень 1943 года для Любаншчыны быў багатым на важныя падзеі. Адной з іх стала рэарганізацыя партызанскага руху.**

Вось што запісаў у сваім дзённіку Аляксандр Далідовіч – камандзір партызанскага атрада імя Гарбачова: «14 студзеня, чацвер. Загадам па партызанскім злучэнні Мінскай і Палескай абласцей на базе атрадаў А.І. Далідовіча, Р.І. Плышэўскага, І.І. Чарнышова і К.М. Дзяшковіча створана партызанская брыгада №25 імя П.К. Панамарэнкі. Камандзірам брыгады прызначаны А.І. Далідовіч, а камандзірам атрада замест яго прызначаны М.І. Фурман. Камісарам брыгады стаў А.А. Баравік, начальнікам штаба брыгады – А.Ф. Лескін».

– Пазней, – прыгадваў потым Арцём Лескін, – у складзе брыгады былі арганізаваны атрады імя Кастуся Каліноўскага, «Камсамолец», Баяніцкі. Месцам дыслакацыі брыгады сталі тэрыторыі Гарадзяціцкага і Нежынскага сельсаветаў. Штаб брыгады размяшчаўся ў вёсцы Малыя Гарадзяцічы. Можна дадаць, што на момант злучэння з часцямі Чырвонай Арміі 1 ліпеня 1944 года ў складзе 25-й налічвалася 1 473 байцы.

Гэтым жа загадам на Любаншчыне была створана партызанская брыгада №64 імя В.П. Чкалава. Тады, у студзені 43-га, у ёй было тры атрады – М.М. Розава, А.І. Патрына і А.Я. Абабкава. А ў маі-жніўні ў 64-й арганізавалі яшчэ тры атрады – імя Р.І. Катоўскага, імя С.Г. Лазо і імя 14 слуцкіх партызан. На момант злучэння з часцямі Чырвонай Арміі ў брыгадзе (камандаваць ёй прызначылі Мікалая Розава, камісарам стаў Аляксей Львоў, а начальнікам штаба – Уладзімір Варатнікоў) было больш за тысячу байцоў. Дакладней – 1 115 партызан.

З ліку важных падзей студзеня 1943 года быў прылёт Міхаіла Барашкава. У канцы 1942 г. Цэнтральны камітэт Кампартыі Беларусі прыняў рашэнне аднавіць выпуск «Звязды» ў зоне дзейнасці партызанскіх злучэнняў. Тады ж Міхаіл Парфёнавіч і быў зацверджаны рэдактарам выдання. Перапраўвіць яго ў глыбокі варожы тыл доўгі час не ўдавалася.

> **Нарэшце ў ноч на 25 студзеня 1943 г. на партызанскім аэрадроме на востраве Зыслаў прызямліўся самалёт з Масквы.**

Гэтым самалётам у партызанскую зону прыбыў вопытны журналіст, даваенны рэдактар рэспубліканскай камсамольска-маладзёжнай газеты «Чырвоная змена» Міхаіл Барашкаў. Ён прывёз з сабою партатыўны друкарскі станок і іншае абсталяванне, шрыфты, тыпаграфскую фарбу, некалькі мяхоў з паперай. А ўжо праз два дні, 27 студзеня, у свет выйшаў першы надрукаваны на Любаншчыне нумар «Звязды». Следам, 31 студзеня, да чытачоў адправіўся і першы «партызанскі» нумар «Чырвонкі».



**Кіраўнікі партызанскага руху і супрацоўнікі рэдакцыі газеты «Звязда», 1943 год. У ніжнім радзе (злева направа): А.С. ШУРПАЧ, Н.А. ЦЫЛЬКО, П.Ц. КАСЦЮКАВЕЦ, Н.Г. КУРЫКА; у сярэднім радзе: І.Д. ВЕТРАЎ, Н.Е. АЎХІМОВІЧ, В.І. КАЗЛОЎ, І.А. БЕЛЬСКІ; у верхнім радзе: С. ЛЯШЧЭНЯ, М.П. БАРАШКАЎ, К.Т. МАЗУРАЎ, М.Л. ПАЗНЯК.**

Падпольны друк Беларусі ўпісаў слаўную старонку ў гісторыю савецкай прэсы ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Дастаткова сказаць, што на часова акупаванай гітлераўцамі тэрыторыі краіны выходзіла газет больш, чым да вайны. Так-так, тады наша Сінявокая была не толькі класічнай партызанскай рэспублікай, але і рэспублікай масавага падпольнага партыйнага і партызанскага друку. Правафланговай яго з'явілася газета «Звязда» – цэнтральны орган Кампартыі Беларусі.

З першых дзён фашысцкага нашэсця на Савецкі Саюз «Звязда» ўзнімала беларускі народ на свяшчэнную вайну з нямецкімі акупантамі. Калі гітлераўцы захапілі Мінск, рэдакцыя перабралася спачатку ў Магілёў, а потым у Гомель. Там 13 жніўня 1941 года і выйшаў апошні легальны нумар газеты.

Менавіта выпуск «Звязды» – аднаго з любімейшых і аўтарытэтнейшых сярод беларусаў перыядычных выданняў – было вырашана аднавіць у падполлі. Такую надзвычай адказную і небяспечную справу даручылі актыўнаму ўдзельніку руху супраціўлення ў сталіцы нашай рэспублікі, учарашняму студэнту Камуністычнага інстытута журналістыкі Уладзіміру Амельянюку. Першы нумар падпольнай «Звязды» – ужо органа Мінскага гаркама КП(б)Б – убачыў свет 18 мая 1942 года. Тыраж выдання складаў дзве тысячы экзэмпляраў.

Гэтая падзея мела для гітлераўцаў эфект узарванай бомбы. Вораг добра ўсвядоміў, якую пагрозу нясе газета.

> **Для пошуку падпольнай друкарні з Берліна выклікалі вопытных разведчыкаў. Друкарню яны так і не знайшлі.**

Але 26 мая 42-га каля Чырвонага касцёла ў Мінску быў забіты Уладзімір Амельянюк (праз дваццаць гадоў пасля Перамогі яму пасмяротна прысвоілі званне Героя Савецкага Саюза). Зрэшты, трагічная гібель Уладзіміра Сцяпанавіча не спыніла выпуск «Звязды», хаця і вымусіла падпольшчыкаў перавесці друкарню ў іншае месца. Усе ж абавязкі па выданні газеты перайшлі да членаў Мінскага падпольнага гаркама Вячаслава Нікіфарава, Ядвігі Савіцкай і Уладзіміра Казачонка.

З неймавернымі цяжкасцямі ўдалося надрукаваць другі, трэці і чацвёрты нумары «Звязды». Пяты быў набраны і звярстаны – яго выхад намячаўся на 27 верасня 42-га. Аднак у свет ён так і не выйшаў: у ноч на 26 верасня гітлераўцы арыштавалі дваццаць аднаго падпольшчыка, у ліку якіх быў і Вячаслаў Нікіфараў. А на ім якраз у большай ступені і ляжала адказнасць за выданне газеты. Многія з арыштаваных закатавалі ў фашысцкіх засценках да смерці, лёс некаторых невядомы і сёння…

Рэдакцыя і друкарня «Звязды»-партызанкі атаўбавалася на Любаншчыне ў глухой вёсцы 6-я Брыгада – у дзвюх крайніх хатах, у якіх жылі салдаткі Марфа Мігун і Марыя Бубіч. І адразу ж закіпела работа. Над выпускам газеты працавалі былы рэдактар любанскай раёнкі Піліп Касцюкавец, былы супрацоўнік «Советской Белоруссии» Георгій Шчарбатаў, Аляксандр Сакевіч, Мікалай Курыка, Ніна Цылько і Амяльян Шурпач. «Звязда» выходзіла два разы на тыдзень – у суботу і сераду. «Чырвоная змена» – раз у тыдзень.

– Кароткія зімовыя дні... – успамінаў пасля вайны Амяльян Шурпач. – Ледзь паспявалі да прыцемкаў набраць газету. Вярсталі, правілі і друкавалі пры дрыготкім святле смалякоў. Днём часу для адпачынку таксама не ставала. Шчарбатаў, Касцюкавец, Сакевіч і я адпраўляліся па атрадах і брыгадах у пошуках матэрыялаў, Міхаіл Парфёнавіч рыхтаваў наступны нумар. Ён перапісваў для набору ўсе тэксты.

«Звязда» хутка заваявала шырокага чытача. За дзень да выхаду газеты ў штабе ўжо сядзелі сувязныя з розных партызанскіх фарміраванняў, ад падпольных арганізацый гарадоў і вёсак. Тыраж у пяцьсот экзэмпляраў разыходзіўся ў момант! На старонках «Звязды» расказвалася пра падзеі на фронце, паведамлялася аб выніках «рэйкавай вайны», аб дыверсіях найбольш актыўных груп, выкрывалася лжывая фашысцкая прапаганда, друкаваліся заклікі актыўней брацца за зброю, бязлітасна знішчаць жывую сілу і тэхніку гітлераўцаў, каб наблізіць перамогу.

> **Рэдакцыя газеты і друкарня нярэдка мяняла месца свайго размяшчэння ў сувязі з карнымі аперацыямі акупантаў.**

«У канцы сакавіка 1943 года, – прыгадваў Амяльян Шурпач, – карнікі нечакана прарваліся зусім блізка да нашай вёскі. Партызаны спынілі іх на рацэ Арэсе за чатыры кіламетры ад 6-й Брыгады. Стрэлы чуліся зусім блізка…» «Звяздоўцам» давялося хутка збіраць свой рыштунак, грузіць на вазы і рушыць у балота. Там, на востраве Добры, і знайшла часовы прытулак рэдакцыя ды друкарня. Потым былі вёска Рэпін Акцябрскага раёна, вёска Камсамолец Старобінскага, стаянкі ў навакольных лясных масівах.

Для выпуску газеты часта не хапала тыпаграфскай фарбы, паперы. Выручала партызанская кемлівасць: тую ж паперу, напрыклад, народныя мсціўцы куплялі ў… немцаў. Варта адзначыць, што першапачаткова «Звязда» выходзіла фарматам у адну восьмую друкаванага аркуша. З 14 жніўня 1943 года рашэннем ЦК КП(б)Б фармат газеты быў павялічаны ўдвая.

Уплыў жа на насельніцтва акупаваных гітлераўцамі тэрыторый «Звязда» аказвала магутны. Вось адзін, але надзвычай красамоўны выпадак. У кастрычніку 43-га група партызан на шашы Слуцк–Бабруйск знішчыла дзве аўтамашыны гітлераўцаў. Сярод трафеяў аказаўся рапарт слуцкага гебітскамісара, у якім даваліся тлумачэнні частым дэзерцірствам з паліцыі і прычынам росту партызанскага руху. Усю адказнасць фашыст ускладваў на падпольны друк, і ў прыватнасці на «Звязду», прыкладвалася газета (№78 ад 22 верасня 1943 года) і некалькі лістовак.

Падпольная «Звязда» была не толькі баявым органам вялікай арміі народных мсціўцаў і падпольшчыкаў, але і надзейным сябрам беларускай падпольнай прэсы, своеасаблівай школай для партызанскіх журналістаў, якія наладжвалі выпуск савецкіх абласных і раённых газет у тыле гітлераўцаў. Нават часам дзяліліся ўласнымі кадрамі: калі ў красавіку 43-га паўстала пытанне аб выданні любанскай падпольнай газеты «Кліч Радзімы», якую не было каму рэдагаваць, Міхаіл Барашкаў даў згоду накіраваць на згаданую пасаду «звяздоўца» Аляксандра Сакевіча.

Сам жа Міхаіл Парфёнавіч не толькі рэдагаваў «Звязду» і «Чырвоную змену», ён разам з супрацоўнікамі рэдакцыі і друкарні неаднаразова ўдзельнічаў у баях, быў прыкладам мужнасці, адвагі і цягавітасці для народных мсціўцаў. На вялікі жаль, у студзені 1944 года Міхаіл Барашкаў захварэў на запаленне лёгкіх і тыф. Умовы падполля, зразумела, не спрыялі эфектыўнаму лячэнню, і 21 лютага 44-га рэдактара «Звязды» не стала. Яго пахавалі непадалёку ад вёскі Камсамолец цяперашняга Салігорскага раёна.

Смерць Міхаіла Парфёнавіча не спыніла выхад газеты. Яна клікала на барацьбу з ворагам да моманту вызвалення нашых мясцін ад акупантаў. Апошні «партызанскі» нумар газеты быў надрукаваны ў вызваленым ад фашыстаў Слуцку. Усяго ў партызанскай зоне ўбачыла свет 105 нумароў «Звязды», 98 з іх былі выпушчаны на Любаншчыне.

**Сяргей КВІТКЕВІЧ, супрацоўнік Любанскага музея народнай славы.**
**Фота з фондаў Любанскага музея народнай славы.**